# З прыбеседскіх далін

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

*Памяці пісьменніка-земляка Якуба Раманавіча Брайцава.*

З палёў прыбеседскіх далін,
Нібы рачныя хвалі ў моры,
Былінамі былых часін
Да нас яго даходзяць творы.
У Забялышыне – сяле,
Што каля Хоцімска на ўзлессі,
Ён жыў і працаваў, але
Свае замоўчваў доўга песні.
З маленства заўважаў, што ёсць
У краі творчы дух і сіла,
Зямлі радзімай прыгажосць
Яго да творчасці натхніла.
Пісаў для бедных мужыкоў,
Хоць твор "Багатыя" меў назву.
І з самых ён глухіх куткоў
Шлях да сваёй зямлі падказваў.
І справа яшчэ была адна,
У якую ўвесь быў улюбёны:
Чакаў заўжды – калі вясна
Раскіне свой убор зялёны.
Суседзі ў полі рэй вялі,
Каб пракарміць сябе і дзетак, –
А ён на ўласнае зямлі
Вырошчваў многа розных кветак.
Ужо вядомым творцам быў,
Ды, разважаючы сам-насам,
Ён тыя кветкі так любіў –
Больш чым пастух свой статак часам...
Не для паноў ён іх расціў,
А для сваіх герояў твора –
Для тых, хто спелы водар піў
З палёў блакітнага прастора.
Мог на маленькай паласе
У ружы край увесь прыбраца,
І ведалі ў акрузе ўсе,
Што вырасціў Якуб іх Брайцаў.
Лічыў з юнацкае пары
Ён кветкі творчаю удачай.
Але з раёна ўладары
Прыйшлі яго каб "раскулачыць".
За што? За тое, што вясной
Нёс прыгажосць ён лепшай долі...
І я стаю от пад сасной,
Дзе мой зямляк ляжыць у полі.
Ён кветкамі ўпрыгожваў свет,
Дзяліўся творчасцю сваёю.
Кладу жывы яму букет,
Што ўзрошчаны яго зямлёю.

**Прыходзька П. З прыбеседскіх далін** : памяці пісьменніка-земляка Якуба Раманавіча Брайцава : верш / П. Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 2001. — 17 лютага. — С. 2.